Л.Г.Бараноўская (Магілёў)

# СЭНСАВАЯ АБ'ЁМНАСЦЬ ВОБРАЗАЎ ВАЎКА І ВАЎКАЛАКА Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Кожная нацыянальная літаратура мае сваю сістэму вобразаў, матываў, сімвалаў. Адзін і той жа мастацкі вобраз у культурных традыцыях розных краін свету можа атаясамлівацца з самымі разнастайнымі паняццямі. Прыкладам таму можа паслужыць мастацкае асэнсаванне вобраза ваўка, які са старажытных часоў прысутнічае ў міфалогіях розных народаў Еўразіі і Паўночнай Амерыкі. У большасці з міфаў ён асацыіруецца з вайной (воўчая зграя сімвалізуе баявую дружыну). Падчас воўк з'яўляўся татэмам, калі продак – правадыр пэўнага племені – выступаў у вобразе гэтай жывёлы або здольны быў ператварацца ў яго.

архив библиотеки МГУ имени А

Што датычыцца ўсходнеславянскіх традыцый, вобраз ваўка шырока прадстаўлены ў творах вуснай паэтычнай творчасці. Прыкладам таму могуць быць усходнеславянскія казкі («Воўк, авечка і ліса», «Воўк-дурань», «Сабака і воўк» і інш.).

Беларускія, рускія, украінскія паданні, легенды сведчаць аб тым, што вобраз ваўка з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных сярод іншых анімалістычных вобразаў. Часта сустракаецца гэты вобраз і ў творах беларускай літаратуры. Да яго звярталіся такія класікі, як Я.Колас, Я.Купала, А.Гарун, нярэдка сустракаецца ён і ў сучаснай літаратуры (у вершах А.Разанава, Я.Сіпакова, паэме С.Законнікава «Чорная быль» і інш.).

Сярод твораў Янкі Купалы можна налічыць некалькі дзесяткаў, дзе паэт выкарыстоўвае вобраз ваўка. Яму прысвечаны нават асобны верш.

Топчачы верас і мох
Цёмных імшараў і лоз,
Выбрыў на сонны разлог,
На асляпнелы пакос.

Зубам ляскоча аб зуб,
Вочы палаюць агнём;
Стаў, як калода, як слуп,
Стаў і азваўся выццём.

(«Воўк») [2 , с. 164]*

Па дадзеным «Слоўніка мовы Янкі Купалы», вобраз ваўка ў мастацкіх і публіцыстычных творах сустракаецца 93 разы ў наступных значэннях: як дзікая жывёліна сямейства сабачых («Скубець скаціна, а пастыр // Пасе, пільнуе ад ваўка, // Снуе вакол, уздоўж і ўшыр, // То цёлку злае, то быка» («Пры скаціне»)) [I, с. 310]; у значэнні дзеючай асобы (у байках) ([Воўк:] Ах, баранок мой, ах, бараночак! // Вось і настрэўся ты мне, дружочак» («Воўк і баран»)) [I, с. 399]) , у пераносным значэнні воўк як люты вораг ужываецца ў публіцыстычных творах («Зграя ашалелых ваўкоў меркавала, <...> што варта будзе ім толькі пераступіць мяжу Савецкай краіны, як пачнуцца канфлікты паміж рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй («Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя») [7, с. 393]).

Найбольш часта гэты вобраз сустракаецца ў дакастрычніцкай лірыцы Я.Купалы. Але тут ён трактуецца двояка. З аднаго боку,

* Тут і далей творы і пераклад «Слова аб паходзе Ігаравым» Янкі Купалы цытуюцца па: Купала Я. Збор твораў: У 7 т. – Мн., 1972–1976. У дужках пазначаецца першай лічбай нумар тома, другой – старонка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

з ваўком параўноўваецца бядняк, мужык, народ («На свет будзеш глядзець // Ашалелым ваўком [тут і далей падкрэслена намі – Б.Л.]; // Песні ўздумаеш пець, – // Адазвешся выццём» («Нуда») [1, с. 31]). Аўтар кажа пра тое, што ў збяднелага народа доля, лёс ваўка. З другога боку, вобраз драпежніка асацыіруецца ў Я.Купалы з пануючым класам («Мучыцель толькі рад, снуецца, // Як шакал дзікі па трупах, – // З ахвяр сваіх ваўком смяецца, // З ахвяр, што мруць у ланцугах» («З песень а бітвах») [1, с. 37]).

Вобраз ваўка як прадстаўніка пануючага класа неаднойчы сустракаецца ў казачных тэкстах, творах класічнай літаратуры (параўн. пушкінскія радкі: «Пробегал тут волк дворянин, у него-то зубы закусливые, // У него-то глаза завистливые»).

У лірыцы Я.Купалы вобраз ваўка ўвасабляе цёмныя сілы, зло, нядобрае. У паэме «Адплата кахання» з ваўком параўноваюцца нядобрыя думкі:

Так чорныя думы адна за адною
Ваўкоў згаладалых, не сытых ніколі,
Шукаючы жыру, валочацца ў полі,
Валочацца, аж дзе ахвяру спаткаюць
І выдзеруць сэрца, і вочы зглытаюць.
Эй, страшна, эй, жудка спаткацца з ваўкамі,
Страшней жа з тым зверам, што ходзіць між намі,
Як мы, чалавекам, а сэрцам – пантэра;
О, гэткі звер горшы за ўсякага звера! [5, с. 45].

Яшчэ больш страшныя карціны рэчаіснасці прадстаюць перад рэцыпіентам ў вершах, дзе адлюстравана выццё ваўка: «Воўк з імшараў выбрыў сонных // На ваколіцу пустую // І завёў сваю старую // Думу-думаў беспрыпынных» («Зазімак») [1, с. 318]; «Ціха дрэмле поле бітвы, // Шэпча блізкі лес малітвы; // Выбрыў воўк з сваёй бярлогі, // Выць пачаў на ўсе разлогі // Выць пачаў у хаўтарны тон, // Зубы скалячы на плён» («Песні вайны») [3, с. 276]; «Завыюць ваўкі над курганамі, // Свет заліты крывавым агнём» («З песень аб няволі») [1, с. 178]. Разам з тым выццё ваўка выклікае спачуванне: «Не бойцеся… // Утуліць ад холаду, // Спаўе, як пялёнкай, сны белы, // Зацягне вам песню мяцеліца, // Воўк жальбай завые скалелы» («Зімою») [5, с. 10]. Дарэчы, выццё ваўкоў у славянскай традыцыі прарочыць: пашчай прама або каля хаты – вайну, уверх – голад, да зямлі – мор, восенню – дажджы, зімою – завіруху. Нярэдка вобраз ваўка сустракаецца там, дзе гаворка ідзе пра смерць («Ваўкі па сцежках шляюцца // І ночкаю, і днём // І жудка разганяюцца // Магільніцкім выццём» («Зіма»), [1, с. 325];

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«Ваўкі збіваюцца // Парой зімоваю // І пяюць, выючы. // Песнь па-
-рабоваю» («Над магіламі») [1, с. 339]).

У купалаўскіх пейзажных замалёўках воўк сустракаецца як
тыповы прадстаўнік беларускай прыроды («На купалле там птушка
садзіцца, пяе, // У пілінаўку воўк нема вые…» («Курган» [5, с. 71]):
«Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор, // Ці запеў салавей, ці загагала
гусь, – // Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор, // Сваю матку-
зямлю – Беларусь («Гэты крык, што жыве Беларусь» [1, с. 254]).

Непасрэдным чынам з вобразам ваўка ў лірыцы Янкі Купалы
звязаны вобраз ваўкалака. Паводле славянскай культурнай тра-
дыцыі, воўк з'яўляецца адным з таямнічых вобразаў, побач з якім
стаіць не менш загадкавы вобраз ваўкалака (ваўкалакам называлі
чалавека, які валодаў здольнасцю ператварацца ў ваўка). У «Сло-
ве аб палку Ігаравым» сустрэнем звесткі пра славутага князя Усяслава Чарадзея, які мог абярнуцца ў ваўкалака: «Усяслаў-князь
людзям суд судзіў, // Гарадамі князёў надзяляў, // А сам поначы,
свету на дзіў, // Ваўкалакам ці воўкам гуляў» [5, с. 271]. Матыў
пярэваратня існуе і ў іншых міфалогіях народаў свету (чалавек мог
ператварацца ў мядзведзя, льва і г.д.).

У вершах Я. Купалы вобраз ваўкалака, як і ваўка, падаецца
як інфернальны, які нясе з сабой смерць, страх: «Шыпяць, свішчуць
па лугах // Вужы, скарпіякі, // А па стайнях, па хлявах // Ляцяць
ваўкалакі» («Люлі, люлі, мужычок!») [1, с. 279]; «Барадой лясун
ківае, // Шалы нетрай спавівае; // Ваўкалак за дамавінай // Выпаў-
зае на пуціну». («Хохлік») [3, с. 23]; «Жэняць ведзьму з ваўкала-
кам, // Сватае шынкар» («Забытая карчма») [1, с. 187].

Такім чынам, трактоўка вобраза ваўка і ваўкалака ў твор-
часці Янкі Купалы мае фальклорную аснову, яна мела працяг у бе-
ларускай мастацкай літаратуры. Але ж з часам, асабліва ў другой
палове XX стагоддзя і ў пачатку XX, калі ў літаратуры ўсё больш
актыўна стала асэнсоўвацца экалагічная праблема, вобраз ваўка
набыў новую ідэйна-мастацкую трактоўку. Цяпер воўк часцей аса-
цыіруецца не з драпежнікам, які наводзіў жах на людзей, а з безабаронным, бездапаможным зверам (параўн. у Я.Купалы : «О, гора
падарожнаму // Іх стада напаткаць! // Не жыць неасцярожнаму, //
Радкі не аглядаць. // І вырвуць вочы ясныя, // І выхлебаюць кроў, // І
пойдуць далей, страшныя, // Шукаць ахвяр ізноў»; У Янкі Сіпако-
ва: «Кранаў за сэрца голас яе слабы, // Хоць ён і з пашчы воўчае
выходзіў» («Ваўчыца ў звярынцы») [3, с. 112]).

Творчасць Я.Купалы ў гэтым сэнсе дае ўзор традыцыйнага
погляду на ваўка і ваўкалака як сімвала моцы, вайны, страху, што

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з'яўляецца кантрастам з асэнсаваннем гэтых вобразаў у мастацкай літаратуры на сучасным этапе.

## Спіс літаратуры


1. Купала Я. Збор твораў: У 7 т. - Мн., 1972-1976.
2. Маковский М.М. Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках: Образ мира и миры образов. - М., 1996.
3. Сіпакоў Я. Выбраныя творы: У 2 т. Т. 1. - Мн., 1995.
4. Слоўнік мовы Янкі Купалы: У 8 т. Т. 1. - Мн., 1997.